ДЗЯРЖАЎНАЯ НАВУКОВАЯ ЎСТАНОВА
«ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ
АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ»

Аб’ект аўтарскага права
УДК 94(476)“1921/1939”

**АНАНЬКА
Кірыл Дзмітрыевіч**

# БЕЛАРУСКІЯ ГІМНАЗІІ Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1921–1939 гг.)

АЎТАРЭФЕРАТ
дысертацыі на саісканне вучонай ступені
кандыдата гістарычных навук

па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя

Мінск, 2025

Навуковая работа выканана ва ўстанове адукацыі
«Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы»

| | |
|---|---|
| Навуковы кіраўнік | **Горны Аляксандр Сяргеевіч**, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін факультэта гісторыі, камунікацыі і турызму ўстановы адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы» |
| Афіцыйныя апаненты: | **Даніловіч Вячаслаў Віктаравіч**, доктар гістарычных навук, дацэнт, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь |
| | **Цымбал Аляксандр Георгіевіч**, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры гісторыі і сацыяльных навук установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт замежных моў» |
| Апаніруючая арганізацыя | Установа адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна» |

Абарона адбудзецца 15 кастрычніка 2025 г. у 14.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 01.40.01 на саіскание ступені кандыдата гістарычных навук пры Дзяржаўнай навуковай установе «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» па адрасе: 220072, г. Мінск, вул. Акадэмічная, 1; тэлефон вучонага сакратара: 8 (017) 387-85-19; e-mail: lakvadim@yandex.ru

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Дзяржаўнай установе «Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» па адрасе: 220072, Мінск, вул. Сурганава, 15.

Аўтарэферат разасланы 13 верасня 2025 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый В. Л. Лакіза

# УВОДЗІНЫ

Вывучэнне розных аспектаў навейшай гісторыі Беларусі з’яўляецца важным у раскрыцці працэсаў пабудовы беларускай дзяржаўнасці. Асабліва значным момантам у гэтым стала барацьба беларускага народа за сваю нацыянальную ідэнтычнасць у міжваеннай Заходняй Беларусі. Польска-савецкая вайна 1919–1921 гг. і падпісанне Рыжскага мірнага дагавора 18 сакавіка 1921 г. прывялі да штучнага падзелу тэрыторыі Беларусі, у выніку чаго былі створаны неспрыяльныя ўмовы для яе палітычнага, сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка, выступаючы з нагоды Дня народнага адзінства 17 верасня 2024 г., адзначыў: «Усе гарантыі нацыянальна-культурнага жыцця беларусаў у складзе польскай дзяржавы засталіся толькі на паперы. У Заходняй Беларусі не было нават самай адносна малой аўтаноміі. Беларуская культура існавала ва ўмовах пастаяннай барацьбы за выжыванне. Сталі знікаць нацыянальныя школы, тэатры, газеты» [1]. Уключэнне тэрыторыі Заходняй Беларусі ў склад Польшчы прывяло беларускае насельніцтва да асэнсавання праблемы сваёй нацыянальнай ідэнтычнасці ва ўмовах палітыкі асіміляцыі.

Нягледзячы на дастаткова падрабязнае вывучэнне грамадска-палітычнай і культурнай гісторыі Заходняй Беларусі міжваеннага перыяду шэрагам беларускіх і замежных даследчыкаў, асобныя з яе аспектаў да сённяшняга часу застаюцца па-за межамі ўвагі навуковага гістарычнага дыскурсу. У гэтым кантэксце маладаследаванай праблемай нацыянальна-культурнага жыцця заходнебеларускага рэгіёна з’яўляюцца беларускія гімназіі – установы сярэдняй адукацыі (сярэднія школы) з беларускай мовай навучання на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд, створаныя альбо рэарганізаваныя беларускімі актывістамі і арганізацыямі з мэтай пашырэння нацыянальнай ідэнтычнасці і развіцця адукацыйнага працэсу. Усяго існавала 7 беларускіх гімназій, якія знаходзіліся ў Вільні, Навагрудку, Гродна, Нясвіжы, Гарадку, Клецку і Радашковічах. Варта адзначыць, што беларускія сярэднія школы выконвалі не толькі адукацыйную функцыю, але і ўплывалі на культурныя і грамадска-палітычныя працэсы. Менавіта яны сталі адным з цэнтраў нацыянальна-культурнага жыцця, якія садзейнічалі фарміраванню новага пакалення беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі.

*Актуальнасць тэмы даследавання* абумоўлена шэрагам важных фактараў. Па-першае, утварэнне і функцыянаванне беларускіх гімназій адбывалася ва ўмовах асіміляцыйнай палітыкі польскіх уладаў. Аналіз дзейнасці гімназій дазваляе ацаніць ступень развіцця нацыянальных працэсаў у беларускім грамадстве ў міжваенны перыяд і магчымасцей захаваць

беларусам сваю ідэнтычнасць у неспрыяльных умовах. Па-другое, беларускія гімназіі сталі месцамі канцэнтрацыі беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі, якая фарміравала ў маладога пакалення беларусаў разуменне каштоўнасці ўласнай дзяржаўнасці. Па-трэцяе, гімназіі сталі адным з цэнтраў захавання культурнай спадчыны і традыцый, спрыялі распаўсюджванню беларускай мовы і культуры ў рэгіёне. На сённяшні час у айчыннай гістарыяграфіі асаблівая ўвага звернута на вывучэнне нацыянальных працэсаў на беларускіх землях у ХХ ст. і станаўлення беларускай дзяржаўнасці. Беларускія гімназіі ў міжваеннай Заходняй Беларусі былі тымі ўстановамі, якія актыўна ўплывалі на дадзеныя працэсы і забяспечвалі пашырэнне нацыянальнай самасвядомасці. Без аналізу іх дзейнасці немагчыма грунтоўна прасачыць развіццё нацыянальных працэсаў ў моладзевым асяроддзі Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг.

Дзейнасць беларускіх гімназій у Заходняй Беларусі з'яўляецца неад'емнай часткай нацыянальна-вызваленчай барацьбы беларускага народа супраць палітыкі паланізацыі ў міжваенны перыяд. Дадзеныя ўстановы адукацыі могуць стаць гістарычным прыкладам для выхавання патрыятызму і павагі да нацыянальных каштоўнасцей сярод моладзі ў сучаснай Рэспубліцы Беларусь. Многія выкладчыкі і вучні беларускіх гімназій (Р. Шырма, С. Паўловіч, Я. Драздовіч, А. Валынчык, М. Кахановіч, П. Скрабец, В. Таўлай, М. Танк, Я. Міско, А. Шыдлоўскі і інш.) сталі ўзорам адданасці справе пашырэння беларускай культуры. Прыклад іх дзейнасці можа быць выкарыстаны для маральна-патрыятычнага выхавання беларускай моладзі.

На сучасным этапе развіцця гістарычных ведаў актуальным з'яўляецца ўвядзенне ў навуковы зварот новых матэрыялаў і фактаў аб складаных працэсах гісторыі Заходняй Беларусі ў міжванны перыяд. Навуковае даследаванне дадзенай праблемы дазволіць стварыць падставы для ўшанавання памяці аб дзейнасці беларускіх гімназій, што з'яўляецца адной з прыярытэтных задач гістарычнай палітыкі сучаснай Рэспублікі Беларусь.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

### Сувязь работы з навуковымі праграмамі (праектамі), тэмамі

Дысертацыйнае даследаванне адпавядае п. 6 «Забеспячэнне бяспекі чалавека, грамадства і дзяржавы» Прыярытэтных напрамкаў навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці на 2021–2025 гады ў Рэспубліцы Беларусь, зацверджаных Указам Прэзідэнта ад 07.05.2020 № 156. Дысертацыя выканана ў рамках гранта Беларускага рэспубліканскага фонда фундаментальных даследаванняў «Мой першы грант – 2024» № Г24МП-012

па тэме «Беларускія гімназіі ў міжваенны перыяд: грамадска-палітычны і культурны аспекты» (тэрмін выканання з 02.05.2024 па 31.03.2026).

**Мэта, задачы, аб’ект і прадмет даследавання**

*Мэта* – раскрыць станаўленне і асаблівасці развіцця беларускіх гімназій у Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд, іх уплыў на захаванне нацыянальнай ідэнтычнасці ва ўмовах палітыкі паланізацыі.

Для дасягнення мэты вызначаны наступныя *задачы*:

– вызначыць і абгрунтаваць перыяды дзейнасці беларускіх гімназій у міжваеннай Заходняй Беларусі;

– выявіць сацыяльны, нацыянальны, канфесійны склад вучняў і прафесійны ўзровень педагагічных калектываў беларускіх гімназій;

– раскрыць уплыў грамадска-палітычных працэсаў у міжваеннай Заходняй Беларусі на стан і ўнутранае жыццё беларускіх гімназій;

– вызначыць спецыфіку беларускіх гімназій як аднаго з цэнтраў нацыянальна-культурнага жыцця і барацьбы беларусаў супраць палітыкі паланізацыі ў Заходняй Беларусі.

*Аб’ект даследавання* – грамадска-палітычнае і культурнае жыццё ў Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. *Прадметам даследавання* з’яўляюцца беларускія гімназіі на тэрыторыі Заходняй Беларусі, іх станаўленне, перыяды і накірункі дзейнасці.

*Храналагічныя рамкі* даследавання абмяжоўваюцца 1921–1939 гг. Ніжняй храналагічнай рамкай быў вызначаны 1921 г., калі заходнебеларускія землі ўвайшлі ў склад Польшчы паводле Рыжскага мірнага дагавора. Верхняя дата вызначаецца вызваленчым паходам Чырвонай Арміі на тэрыторыю Заходняй Беларусі ў верасні 1939 г. і карэннымі зменамі ў сферы адукацыі ў рэгіёне.

*Геаграфічныя рамкі* дысертацыі ахопліваюць беларускія землі былых Гродзенскай, усходніх раёнаў Віленскай і заходніх раёнаў Мінскай губерній, якія ў выніку польска-савецкай вайны і падпісання Рыжскага мірнага дагавора ў сакавіку 1921 г. адышлі да Польшчы. Гэтыя тэрыторыі ўвайшлі ў склад Віленскага, Навагрудскага, Палескага і Беластоцкага ваяводстваў. У міжваенны час за імі замацавалася назва “Заходняя Беларусь”. Геаграфічныя рамкі дысертацыі таксама закранаюць і г. Вільня (сучасны Вільнюс), які з’яўляўся важным цэнтрам грамадска-палітычнага і культурнага жыцця беларусаў у міжваеннай Польшчы.

Пры цытаванні беларускамоўных крыніц і літаратуры захавана мова арыгіналу. Цытаты з іншамоўных дакументаў перакладзены аўтарам на беларускую мову.

**Навуковая навізна**

Дысертацыя з’яўляецца першым у айчыннай гістарыяграфіі комплексным навуковым даследаваннем функцыянавання беларускіх гімназій на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. Дадзена абгрунтаванне беларускіх гімназій як устаноў па захаванні нацыянальнай самасвядомасці беларусаў ва ўмовах палітыкі паланізацыі, распрацавана навуковая перыядызацыя іх дзейнасці. Выяўлены грамадска-палітычныя ўмовы ўтварэння беларускіх гімназій і іх прававое становішча, разгледжаны праекты па ўтварэнні беларускіх сярэдніх школ у розных рэгіёнах Заходняй Беларусі, якія раней у айчыннай гістарыяграфіі не згадваліся. Паказана роля педагогаў і навучэнцаў гімназій у захаванні нацыянальнай ідэнтычнасці беларусаў. На аснове статыстычных і біяграфічных дадзеных складзены калектыўны партрэт педагагічнага корпуса і вучнёўскага складу беларускіх гімназій, раскрыты ўдзел беларускіх гімназій у грамадска-палітычных працэсах Заходняй Беларусі ў 1920–1930-х гг., адлюстраваны ўплыў грамадска-палітычных працэсаў на іх унутранае жыццё. Упершыню прааналізавана спецыфіка беларускіх сярэдніх навучальных устаноў як аднаго з цэнтраў нацыянальна-культурнага жыцця беларусаў на тэрыторыі заходнебеларускага рэгіёна ў міжваенны час ва ўмовах ажыццяўлення польскімі ўладамі палітыкі нацыянальнай асіміляцыі.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону**

1. На працягу геапалітычных працэсаў у 1918–1921 гг. пачалося станаўленне беларускай нацыянальнай сярэдняй школы. Стварэнню беларускіх гімназій у Заходняй Беларусі спрыялі міжнародныя дамоўленасці («Малы Версальскі дагавор», Рыжскі мірны дагавор) і высокая актыўнасць беларускіх арганізацый і грамадскіх дзеячаў. Аднак у рэальнасці заканадаўчыя змены ў польскай дзяржаве адмоўна адбіваліся на становішчы беларускіх гімназій. У дзейнасці беларускіх сярэдніх навучальных устаноў вылучаецца чатыры перыяды. Першы (1919–1921 гг.) – этап фарміравання перадумоў і станаўлення беларускай нацыянальнай сярэдняй школы на тэрыторыі Заходняй Беларусі ва ўмовах польска-савецкай вайны, арганізацыя і ўтварэнне беларускіх гімназій. Другі (1921–1928 гг.) – уключэнне беларускіх гімназій у польскую адукацыйную сістэму як прыватных устаноў сярэдняй адукацыі. Адначасова адбываецца іх уключэнне ў грамадска-палітычныя працэсы Заходняй Беларусі. Трэці (1928–1931 гг.) – актыўнае пранікненне беларускіх левapадыкальных арганізацый (КПЗБ, КСМЗБ, БСРПК і інш.) у гімназічнае асяроддзе ў выніку паланізацыі, наступленне акупацыйных польскіх уладаў на беларускую культурна-асветніцкую справу шляхам звальнення выкладчыкаў і ўціску вучняў. Чацвёрты (1932–1939 гг.) – заканадаўчае адзяржаўленне

беларускіх гімназій у Вільні і Навагрудку, ліквідацыя польскімі ўладамі беларускіх сярэдніх навучальных устаноў, імкненне беларускіх актывістаў і арганізацый да захавання Віленскай беларускай гімназіі як важнага вучэбна-метадычнага цэнтра нацыянальнай адукацыі.

2. Першапачатковы вучнёўскі склад беларускіх гімназій вызначаўся нацыянальнай, канфесійнай, сацыяльнай і гендарнай неаднароднасцю. Аднак з цягам часу ўстановы набылі больш монаэтнічны характар: у іх навучаліся ў асноўным беларусы. У перыяд з 1919 па 1939 гг. праз беларускія гімназіі прайшло каля 3,2 тыс. навучэнцаў. Пераважная іх большасць мела сялянскае паходжанне, акрамя гэтага навучаліся дзеці святароў, настаўнікаў, рабочых, лекараў і інш. Асноўнымі матывамі паступлення дзяцей у беларускія гімназіі былі таннасць адукацыі ў параўнанні з польскімі гімназіямі, а таксама ажыццяўленне навучальнага працэсу на зразумелай мове. На рубяжы 1920–1930-х гг. вучням нярэдка даводзілася пераходзіць з адной беларускай сярэдняй навучальнай установы ў іншую па палітычных прычынах. Педагагічны корпус з'яўляўся шматнацыянальным і поліканфесійным. У асноўным склад педагогаў фарміраваўся з асяроддзя вядомых беларускіх грамадскіх і культурных дзеячаў, якія ставілі перад сабой мэту выхавання новага пакалення маладых беларусаў і далейшага іх удзелу ў нацыянальным руху. Нягледзячы на свой практычны прафесійны вопыт, кваліфікацыя некаторых настаўнікаў не адпавядала фармальным стандартам польскай сістэмы адукацыі. Палітычныя погляды педагогаў беларускіх гімназій, якія былі накіраваны на выхаванне патрыятызму, уплывалі на настроі навучэнцаў, што выклікала пільную ўвагу і рэпрэсіі з боку польскіх уладаў.

3. У першай палове 1920-х гг. уплыў грамадска-палітычных працэсаў на ўнутранае жыццё беларускіх гімназій быў нязначным. Некаторыя педагогі і вучні ўдзельнічалі ў розных палітычных структурах, аднак імкнуліся не ўмешваць беларускія навучальныя ўстановы ў іх дзейнасць. Але ў апошняй трэці 1920-х гг. адбываецца палітычная радыкалізацыя моладзевага асяроддзя гімназій як рэакцыя на разгорнутую польскімі ўладамі барацьбу супраць беларускага нацыянальнага руху. Вынікам такой сітуацыі стаў шэраг палітычных акцый у сценах гімназій, якія прымусілі кіраўніцтва шукаць спробы захаваць навучальныя ўстановы. Такая пазіцыя прывяла некаторых дырэктароў і педагогаў беларускіх гімназій да паланафільскай плыні беларускага нацыянальнага руху з намерам захаваць навучальныя ўстановы ў рамках польскай адукацыйнай сістэмы. Аднак дадзены разлік абумовіў узмацненне уплыву польскіх уладаў на навучальны і выхаваўчы працэс беларускіх гімназій у 1930-х гг.

4. Беларускія гімназіі з’яўляліся адным з цэнтраў нацыянальна-культурнага жыцця міжваеннай Заходняй Беларусі. Іх спецыфічнай рысай было распаўсюджванне беларускай ідэнтычнасці праз вучэбны і выхаваўчы працэсы. Вялікая ўвага ў адукацыйным працэсе надавалася вывучэнню цыклу прадметаў беларусазнаўства: беларускай мовы, беларускай літаратуры, гісторыі Беларусі, геаграфіі Беларусі. Вучэбна-патрыятычнае выхаванне вучняў ажыццяўлялася і на прадметах прыродазнаўчага і тэхнічнага профіляў. Педагогі адыходзілі ад тагачасных традыцыйных метадаў выкладання, распрацоўвалі новыя і ўкаранялі іх у навучальны працэс. У цяжкіх умовах палітыкі паланізацыі беларускія выкладчыкі актыўна займаліся асветніцкай справай, распрацоўвалі падручнікі, праграмы, вучэбна-метадычныя дапаможнікі, ажыццяўлялі перакладчыцкую дзейнасць. Навучэнцы гімназій разгарнулі культурна-асветніцкую дзейнасць ужо з першых дзён існавання беларускіх сярэдніх школ: выпускалі уласныя газеты і часопісы, арганізоўвалі гурткі, праводзілі розныя культурныя мерапрыемствы, займаліся дабрачыннасцю і г.д. Усё гэта з’яўлялася важным кампанентам вучэбна-выхаваўчай працы па захаванні нацыянальнай ідэнтычнасці моладзі і было адным з істотных фактараў у барацьбе беларускага народа супраць паланізацыі. Дзякуючы гэтаму ў маладога пакалення навучэнцаў фарміравалася ўяўленне аб каштоўнасці нацыянальнай дзяржаўнасці.

**Асабісты ўклад саіскальніка вучонай ступені**

Дадзеная дысертацыйная праца з’яўляецца вынікам самастойнага даследавання. Аўтарам было выкарыстана шырокае кола матэрыялаў з архіваў, музеяў і бібліятэк Беларусі і Літвы, якія ўпершыню ўводзяцца ў навуковы зварот. На падставе аналізу заканадаўчых актаў польскай дзяржавы, статыстычных і справаздачных дакументаў адміністрацыйных і паліцэйскіх органаў, эга-дакументаў (мемуары, лісты і г.д.), матэрыялаў міжваенных перыядычных выданняў было праведзена комплекснае даследаванне: выяўлены ўмовы станаўлення і дзейнасці беларускіх гімназій; распрацавана навуковая перыядызацыя іх дзейнасці; складзены калектыўны партрэт вучнёўскага складу і педагагічнага корпуса; вызначана спецыфіка беларускіх гімназій як аднаго з цэнтраў нацыянальна-культурнага жыцця.

**Апрабацыя дысертацыі і інфармацыя аб выкарыстанні яе вынікаў**

Матэрыялы і высновы дысертацыйнага даследавання былі ўкаранены ў навучальны працэс факультэта гісторыі, камунікацыі і турызму ГрДУ імя Янкі Купалы і выкарыстоўваюцца ў ходзе выкладання дысцыпліны «Заходняя Беларусь у складзе Польшчы (1921–1939 гг.)» (акт ад 30.08.2023 № 03–8/037).

Вынікі дысертацыйнага даследавання былі апрабаваны на 18 навуковых і навукова-практычных канферэнцыях рознага ўзроўню: Х Каложскія

адкрытыя абласныя навукова-адукацыйныя чытанні “Секулярный мир и религиозность” (Гродна, 9–10 снежня 2021 г.); VII Міжнародная навуковая канферэнцыя “Социальные, политические и культурные процессы на территории Центральной и Восточной Европы в исторической перспективе” (Пінск, 25–26 лютага 2022 г.); V Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя маладых даследчыкаў Інстытута гісторыі НАН Беларусі “Ars Longa: навуковыя дасягненні і перспектывы” (Мінск, 21–22 красавіка 2022 г.); XII Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя “Институциональная трансформация глобальных систем и процессов: от кризиса к устойчивому развитию” (Варонеж, 31 мая 2022 г.); Міжнародная навуковая канферэнцыя “Пичетовские чтения – 2022: университеты и архивы как составные элементы экологии культуры” (Мінск, 30 верасня 2022 г.); Міжнародная навуковая канферэнцыя “Святло зямлі Гарадзенскай: да 1030-годдзя Праваслаўнай царквы ў Беларусі і 30-годдзя адраджэння Гродзенскай епархіі” (Гродна, 20 кастрычніка 2022 г.); Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя студэнтаў, аспірантаў і маладых вучоных “XVI Машеровские чтения” (Віцебск, 21 кастрычніка 2022 г.); III Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя “Социальные, культурные и коммуникативные практики в динамике общественного развития” (Гродна, 17 лістапада 2022 г.); XI Каложскія адкрытыя абласныя навукова-адукацыйныя чытанні “Глобальные вызовы современности и духовный выбор человека” (Гродна, 8–9 снежня 2022 г.); Міжнародная навуковая канферэнцыя “Смена парадигм в исторической науке: новые вызовы, теоретические поиски, исследовательские практики” (12–14 красавіка 2023 г.); VII Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя “Актуальные проблемы источниковедения” (Віцебск, 27–29 красавіка 2023 г.); VII Міжнародная навуковая канферэнцыя “Берковские чтения. Книжная культура в контексте международных контактов” (Брэст, 24–25 мая 2023 г.); Міжнародная навуковая канферэнцыя па пытаннях сацыяльнай гісторыі Беларусі “Мадэрнізацыя і працэсы сацыяльных трансфармацый у Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XXI ст.” (Мінск, 17 лістапада 2023 г.); III Міжнародная навуковая канферэнцыя “Беларусь в контексте европейской истории: личность, общество, государство” (Гродна, 23–24 лістапада 2023 г.); IX Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя “Этнос и общество в контексте межнациональных отношений” (Краснадар, 7 снежня 2023 г.); X Міжнародная навуковая канферэнцыя “Беларусь и соседи: пути формирования государственности, межнациональные и межгосударственные отношения” (24–25 красавіка 2024 г.); Навукова-практычная канферэнцыя “Навагрудскія чытанні: гісторыя і сучаснасць навагрудскага краю” (Навагрудак, 23 жніўня 2024 г.);

Рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя “1939 год в исторической судьбе белорусского народа” (Брэст, 17 верасня 2024 г.).

**Апублікаванне вынікаў дысертацыі**

Асноўныя вынікі дысертацыйнага даследавання апублікаваны ў 22 навуковых артыкулах, 9 з якіх надрукаваны ў навуковых часопісах, што адпавядаюць п. 19 Палажэння аб прасуджэнні навуковых ступеняў і прысваенні навуковых званняў у Рэспубліцы Беларусь (агульны аб’ём – 6,9 друк. арк.); 7 – у зборніках навуковых артыкулаў, 6 – матэрыялаў і тэзісаў дакладаў навуковых канферэнцый (3,7 друк. арк.). Агульны аб’ём апублікаваных матэрыялаў складае 10,6 друк. арк.

**Структура і аб’ём дысертацыі**

Дысертацыйнае даследаванне складаецца з пераліку скарачэнняў і абазначэнняў, уводзін, асноўнай часткі, якая ўключае 4 главы, заключэння, спіса выкарыстаных крыніц, 8 дадаткаў. Агульны аб’ём працы складае 169 старонак, з якіх асноўны тэкст займае 119 старонак, спіс выкарыстаных крыніц – 23 старонкі і налічвае 350 найменняў (з іх 22 – публікацыі аўтара), дадаткі – 27 старонак.

## АСНОЎНАЯ ЧАСТКА

У **Главе 1 “Гістарыяграфія, крыніцы і метады даследавання”** разглядаецца ступень вывучанасці праблемы ў айчыннай і замежнай гістарыяграфіі, даецца характарыстыка крыніцавай базы і метадаў даследавання.

У **раздзеле 1.1 “Гістарыяграфія праблемы”** звяртаецца ўвага на тое, што праблема арганізацыі і дзейнасці беларускіх гімназій у міжваеннай Заходняй Беларусі не знайшла адлюстравання ў асобным комплексным навуковым даследаванні. Але пры гэтым дадзеная тэма ў некаторай ступені ўжо асвятлялася ў працах беларускіх і замежных даследчыкаў, прысвечаных розным аспектам гісторыі міжваеннай Заходняй Беларусі.

Ужо ў пачатку 1920-х гг. на тэрыторыі самой Польшчы пачалі выдавацца працы, у якіх ўздымалася пытанне нацыянальнага ціску беларусаў, іх прававога становішча ў польскай дзяржаве[1]. Адначасова з гэтым важным прадметам увагі была арганізацыя нацыянальнага адукацыйнага працэса.

[1] Канчар, А. Класавае, нацыянальнае і рэлігійнае змаганне на Беларусі / А. Канчар. – Вільня: Выданне “Нашай думкі”, 1921. – 31 с.; Суліма [Самойла, У. І.] Які «самаўрад» гатуе беларускаму народу Польская Рэспубліка? / Суліма. – Вільня: Выданне газеты «Голас Беларуса», 1924. – 32 с.

З гэтай мэтай публікаваліся брашуры, якія маюць дачыненне да метадаў арганізацыі навучальнага працэсу[2].

Важным унёскам у ацэнку агульнай карціны існавання беларускіх сярэдніх школ сталі навуковыя гістарыяграфічныя канэпцыі даследчыкаў. Даследаванні, дзе закранаўся стан сярэдняй беларускай нацыянальнай адукацыі, узніклі ўжо ў 1920-я гг. у БССР. Гэтыя працы сталі першымі аналітычнымі навуковымі выданнямі, дзе вылучалася рэвалюцыйна-вызваленчая барацьба як рэакцыя на нацыянальную палітыку “панскай Польшчы”. У 1926 г. у Мінску была выдадзена праца М. Лучаніна «Заходняя Беларусь пад панаваннем Польшчы», у якой быў зроблены акцэнт на перашкоды польскіх улад вучням, настаўнікам і выпускнікам беларускіх гімназій[3].

Даследчае пытанне становішча Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы ўздымалася на высокім акадэмічным узроўні ў БССР, бо з’явілася патрэба ў задавальненні патрабаванняў савецкага кіраўніцтва, якое ўважліва сачыла за падзеямі ў заходнебеларускім рэгіёне. У 1926 г. пры Прэзідыуме Інстытута беларускай культуры (з 1929 г. – пры Беларускай акадэміі навук) была арганізавана Камісія па вывучэнні Заходняй Беларусі. У рамках яе работы праводзіліся даследаванні палітычнай і сацыяльнай гісторыі, нацыянальна-вызваленчага руху, эканомікі, культуры, прыроды заходнебеларускага рэгіёна. Трэба падкрэсліць, што савецкія навукова-папулярныя выданні 1920–1930-х гг., прысвечаныя пытанням Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы, рыхтаваліся ў асноўным у выглядзе брашур з эмацыянальна-публіцыстычнымі рысамі, мелі не столькі навуковы, колькі аналітычны характар[4].

Пасля ўз’яднання Заходняй Беларусі з БССР пытанне барацьбы беларускага народа супраць польскай акупацыі ўздымалася ўжо ў гістарычнай рэтраспектыве. У манаграфіі І. Ф. Лочмэля у 1940 г. прадметам увагі стала “шматвяковая барацьба са сваімі прыгнятальнікамі – польскімі панамі”. Ролю

---

[2] Луцкевіч, А. Як вучыць у новай школе? Увагі для вучыцялёў беларускіх сярэдніх школ / А. Луцкевіч. – Вільня: Выданне Віленскай беларускай гімназіі, 1923. – 14 с.; Паўловіч, С. Аб арганізацыі беларускай працоўнай школы / С. Паўловіч. – Вільня: Беларускае выдавецкае таварыства, 1928. – 16 с.

[3] Лучанін, М. Заходняя Беларусь пад панаваннем Польшчы / М. Лучанін. – Менск: Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі, 1926. – 55 с.

[4] Сталевіч, А. Заходняя Беларусь – калонія Польшчы: да 10-годдзя вызвалення БССР ад белапалякаў / А. Сталевіч. – Менск: ЦК Мопр БССР, 1930. – 48 с.; Гарбацэвіч, П. А. Полёнізацыя Заходня Беларусі / П. А. Гарбацэвіч. – Менск: Камісія Заходняй Беларусі БАН, 1932. – 25 с.; Боген, Д. Беларусь пад крывавым бізуном польскіх акупантаў / Д. Боген. – Мінск: Белдзяржвыдавецтва, 1931. – 15 с.; Мятла, П. Аб Таварыстве беларускае школы і яго барацьбе / П. Мятла. – Менск : Беларус. Акад. навук, камісія па вывучэньні Заходняе Беларусі, 1932. – 34 с.

нацыянальнай адукацыі і выхавання аўтар закрануў толькі фрагментарна ў кантэксце дзейнасці ТБШ[5]. У канцы 1930-х – пачатку 1950-х гг. вывучэнне нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі было абмежаваным. Пасля роспуску КПЗБ у 1938 г. палітычная гісторыя Заходняй Беларусі разглядалася павярхоўна, не кажучы ўжо пра пытанні арганізацыі беларускіх нацыянальных школ. Тагачасныя метадалагічныя ўстаноўкі не дазвалялі аб'ектыўна і ўсебакова вывучаць нацыянальна-вызваленчы рух[6].

У 1960–1970-я гг. быў падрыхтаваны цэлы шэраг даследаванняў У. А. Палуяна, І. В. Палуяна і А. М. Мацко, дзе ўздымалася праблема сацыяльна-эканамічнай і палітычнай гісторыі Заходняй Беларусі ў складзе міжваеннай Польшчы[7]. У 1968 г. свет пабачыла калектыўная праца «Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі», дзе асобна быў прадстаўлены раздзел, прысвечаны арганізацыі адукацыйнага працэсу на тэрыторыі Заходняй Беларусі[8]. На працягу 1950–1980-х гг. у беларускай савецкай гістарыяграфіі так і не з'явілася ніводнага комплекснага і грунтоўнага даследавання, цалкам прысвечанага ролі беларускіх гімназій у грамадска-палітычным і культурным жыцці міжваеннай Заходняй Беларусі. Адначасова з гэтым некаторыя элементы функцыянавання гімназій разглядаліся ў працах беларусаў замежжа[9].

У пачатку 1990-х гг. адбываецца станаўленне новага этапу гістарыяграфіі міжваеннай Заходняй Беларусі. У 1993 г. была апублікавана калектыўная праца «Народная адукацыя і педагагічная навука ў Беларусі (1917–1945)», у якой уяўленне аб развіцці беларускай нацыянальнай школы падаецца скрозь прызму старога паняційнага і ацэначнага апарату[10]. Значны ўклад у вывучэнне гісторыі культурна-асветніцкага жыцця ў міжваеннай

---

[5] Лочмель, И. Ф. Очерк истории борьбы белорусского народа против польских панов / И. Ф. Лочмель. – Москва: Воениздат, 1940. – 161 с.

[6] Горбунов, Т. Воссоединение белорусского народа в едином советском социалистическом государстве / Т. Горбунов. – М. : Гос. изд-во полит. лит-ры, 1948. – 232 с.

[7] Полуян, В. А. Революционное и национально-освободительное движение в Западной Белоруссии в 1920–1939 гг. / В. А. Полуян, И. В. Полуян. – Минск : Госиздат БССР, 1962. – 221 с.; Мацко, А. Н. Борьба трудящихся Польши и Западной Белоруссии против фашизма (1933–1939 гг.) / А. Н. Мацко. – Минск : Издательство Академии наук БССР, 1963. – 205 с.

[8] Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі. – Мінск: Народная асвета, 1968. – 621 с.

[9] В. К. [Кендыш, В.] Клецкая беларуская гімназія / В. К. // Часопіс "Віці". – 1957. – № 1. – С. 13–14; Вініцкі, А. Беларускі скаўтынг / А. Вініцкі // Запісы БІНіМ. – 2017. – Т. 39. – С. 14–20; Склубоўскі, В. Школьная справа і беларускі нацыянальна-вызваленчы рух / В. Склубоўскі // Беларускі каляндар на 1967 г. / Галоўнае праўленне Бел. грамадск.-культ. тав-ства – Беласток, 1967. – С. 97–121.

[10] Народная адукацыя і педагагічная навука ў Беларусі (1917–1945) / пад рэд. Г. Р. Сянькевіч [і інш]. – Мінск: Народная асвета, 1993. – 495 с.

Заходняй Беларусі на сучасным этапе ўнёс доктар гістарычных навук А. М. Вабішчэвіч[11].

У 1990–2000-я гг. тэма беларускіх гімназій атрымала значны імпульс у рамках мікрагістарычных даследаванняў на старонках шырокага кола перыядычных выданняў і кніг. Адной з буйных прац у гэтым кірунку стала кніга былога выпускніка НБГ А. Аніўчыка пад псеўданімам Андрэй Чэмер[12].

Пад увагай беларускіх гісторыкаў у апошняе дзесяцігоддзе застаюцца праблемы дзяржаўнай палітыкі польскіх уладаў і нацыянальна-вызваленчай барацьбы ў міжваеннай Заходняй Беларусі. Пытаннем палітыкі польскай улады ў сферы адукацыі падчас польска-савецкай вайны займалася беларуская даследчыца А. Г. Трубчык[13]. Даследаваннем канцэпцыі нацыянальнай палітыкі ўладаў Польшчы адносна беларускай меншасці займаўся А. М. Загідулін[14]. Аналізам уплыву рэжыму "санацыі" на ўстановы адукацыі заходнебеларускіх земляў займаўся гісторык В. І. Крывуць[15]. Пытанне палітычных груп у беларускім нацыянальна-вызваленчым руху і месца беларускіх гімназій у іх застаецца актуальным да сённяшняга часу. Тым не менш, даследчык В. В. Даніловіч у сваёй манаграфіі «Дзейнасць арганізацыі «Змаганне» ў Заходняй Беларусі (1927–1930 гг.)» сцвярджаў, што палітычны раскол у беларускім нацыянальна-вызваленчым руху ўплываў на дзейнасць ТБШ, якое ў свой час каардынавала функцыянаванне гімназій[16]. Над даследаваннем розных аспектаў беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі, у якім пэўнае месца займалі беларускія гімназіі, працаваў А. С. Горны[17].

[11] Вабішчэвіч, А. М. Беларускія гімназіі ў культурна-асветніцкім і грамадска-палітычным жыцці Заходняй Беларусі (1920 – 1930-я гг.) / А. М. Вабішчэвіч // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – 2002. – № 18. – С. 78–90; Вабішчэвіч, А. М. Асвета ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / А. М. Вабішчэвіч. – Брэст : Выд-ва БрДУ, 2004. – 116 с.; Вабішчэвіч, А. М. Нацыянальна-культурнае жыццё Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / А. М. Вабішчэвіч. – Брэст: Выд-ва БрДУ, 2008. – 319 с.

[12] Чэмер, А. Наваградская беларуская гімназія / А. Чэмер. – Вільнюс: UAB "Saverenas", 1997. – 133 с.

[13] Трубчык, А. Г. Палітыка польскай улады ў сферы школьнай адукацыі на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў 1919–1921 гг. : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / Трубчык Алена Генадзьеўна ; Ін-т гісторыі НАН Беларусі. – Мінск, 2017. – 26 с.

[14] Загідулін, А. М. Дзяржаўная палітыка Польшчы ў галіне беларускай адукацыі / А. М. Загідулін // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэма імя Янкі Купалы. Серыя 1. Гуманітарныя навукі. – 2005. – № 2 – С. 13–22; Загідулін, А. М. Беларускае пытанне ў польскай нацыянальнай і канфесійнай палітыцы ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) : манагр. / А. М. Загідулін. – Гродна: ГрДУ, 2010. – 167 с.

[15] Крывуць, В. І. Пад шыльдай «дзяржаўнага выхавання»: рэалізацыя выхаваўчых канцэпцый на тэрыторыі Заходняй Беларусі (1926–1939) : манагр. / В. І. Крывуць. – Баранавічы: РВА БарДУ, 2010. – 195 с.

[16] Даніловіч, В. В. Дзейнасць арганізацыі «Змаганне» ў Заходняй Беларусі (1927–1930 гг.) / В. В. Даніловіч. – Мінск : Беларус. навука, 2007. – 159 с.

[17] Горны, А. С. Беларускія паланафільскія арганізацыі ў грамадска-палітычным і культурным жыцці Заходняй Беларусі (1921–1937 гг.) : дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / А. С. Горны. – Гродна, 2015. – 172 л.

Пытанні арганізацыі і становішча беларускай адукацыі з’яўляліся аб’ектам даследавання ў польскай гістарыяграфіі. У першых працах, якія выдаваліся ўжо ў 1920–1930-я гг., асвятлялася грамадска-палітычнае і культурнае жыццё беларусаў у кантэксце агляду дзейнасці нацыянальных меншасцяў у польскай дзяржаве. У асноўным гэтыя выданні таксама адпавядалі тым ідэалагічным прынцыпам, якія былі ўсталяваны ў міжваеннай Польшчы[18].

Найбольш змястоўнай працай па праблеме школьнай справы нацыянальных меншасцяў у польскай гістарыяграфіі стала манаграфія С. Маўэрсберга[19]. У працы ў агульных рысах ўказваецца на дыскрымінацыйны характар адміністрацыйнай палітыкі ў дачыненні да беларускіх гімназій, раскрываюцца намаганні ТБШ і ТБА па падтрымцы беларускіх школ.

Вывучэннем featured рознабаковых пытанняў беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі, у тым ліку і месца адукацыі ў ім, займалася польская даследчыца К. Гамулка[20]. Становішча розных ступеней беларускай адукацыі ў міжваеннай Польшчы разглядала ў сваіх працах польская даследчыца В. Папроцкая[21]. Сярод іншых даследаванняў неабходна ўзгадаць працы польскага гісторыка М. Семаковіча, у якіх асвятляюцца заканадаўчыя ўмовы і праблемы арганізацыі беларускай адукацыі на рубяжы 1910–1920-х гг.[22]. Неабходна заўважыць, што многія даследчыкі акцэнтавалі сваю ўвагу менавіта на палітыцы польскіх уладаў адносна беларускай адукацыі. Да таго ж у польскай гістарыяграфіі назіраецца недастатковае выкарыстанне крыніц беларускага паходжання, што ў сваю чаргу робіць гэтыя даследаванні абмежаванымі.

У **радзеле 1.2 “Характарыстыка крыніцавай базы”** праводзіцца аналіз пісьмовых крыніц па тэме даследавання, якія можна падзяліць на дакументальныя і апавядальныя.

У класіфікацыі дакументальных крыніц вылучаюцца нарматыўна-прававыя акты, якія ўключаюць у сябе афіцыйныя законы, распараджэнні і

[18] Srokowski, K. Sprawa narodowościowa na kresach wschodnich / K. Srokowski. – Kraków: Czasu, 1924. – 56 s.; Wysłouch, S. Białorusini na Ziemi Wileńskiej / S. Wysłouch // Wilno i Ziemia Wileńska: zarys monograficzny : w 2 t. – Wilno : Wydawnictwo wojewódzkiego komitetu regjonalnego, 1930. – T. 1. – S. 250–261; Ełski, S. Sprawa białoruska. Zarys historyczno-polityczny / E. Ełski. – Warszawa: Drukarnia współczesna, 1931. – 105 s.

[19] Mauersberg, S. Szkolnictwo powszechne dla mniejszości narodowych w Polsce w latach 1918–1939 / S. Mauersberg. – Wrocław ; Warszawa : Ossolineum Wydawnictwo Polskiej Akademii Nauk, 1968. – 230 s.

[20] Gomółka, K. Białorusini w II Rzeczypospolitej / K. Gomółka // Zeszyty Naukowe Politechniki Gdańskiej. Ekonomia. – 1992. – № 31. – S. 3–178.

[21] Paprocka, W. Szkolnictwo białoruskie na Kresach Wschodnich w świetle polityki mniejszościowej II Rzeczypospolitej / W. Paprocka // Etnografia Polska. – 1998. – № 42. – S. 51–72.

[22] Siemakowicz, M. Organizacja białoruskich gimnazjów i seminariów nauczycielskich w II Rzeczypospolitej / M. Siemakowicz // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – 1999. – № 11. – S. 126–147.

дэкрэты урадавых і ведамасных органаў, якія выдаваліся ў «Часопісе законаў Рэспублікі Польшча» і «Афіцыйным часопісе Міністэрства веравызнанняў і публічнай асветы». Асобныя дакументы ў гэтых зборніках рэгулявалі прававое становішча беларускіх гімназій у дзяржаўнай польскай сістэме адукацыі.

Пэўная маса дакументацыі па тэме дысертацыі знаходзіцца ў Літоўскім цэнтральным дзяржаўным архіве (ЛЦДА): фонд 53 (Віленскае гарадское староства), фонд 172 (Навучальныя ўстановы ва Усходняй Польшчы і Цэнтральнай Літве), фонд 207 (Беларуская Гімназія бацькоўскага камітэта ў Клецку), фонд 220 (Дзяржаўная духоўная праваслаўная семінарыя ў Вільні), фонд 905 (Віленская беларуская гімназія). Да матэрыялаў дакументальнага характару адносяцца дакументы з фондаў 87 (інспектар Гродзенскай школьнай вобласці Віленскай школьнай акругі), 557 (Клецкае гміннае праўленне) і 568 (Клецкая дзяржаўная гімназія Віленскай школьнай акругі) Дзяржаўнага архіва Гродзенскай вобласці (ДАГВ).

Удзел беларускіх гімназістаў у грамадска-палітычных працэсах Заходняй Беларусі адлюстроўваўся ў справаздачах польскіх паліцэйскіх органаў і спецслужбаў, дакументацыя якіх утрымліваецца у фондах 20 (2-гі камісарыят дзяржаўнай паліцыі г. Гродна Беластоцкага ваяводства), 93 (Пракурор Гродзенскага акруговага суда г. Гродна), 541 (Нясвіжскае павятовае староства) і 551 (Навагрудскае ваяводскае ўпраўленне Міністэрства ўнутраных спраў) ДАГВ.

Матэрыялы аналагічнага характару захоўваюцца ў фондах 10 (Вілейская павятовая камендатура дзяржаўнай паліцыі Навагрудскай акруговай камендатуры дзяржаўнай паліцыі) і 509 (Дзісенская павятовая камендатура дзяржаўнай паліцыі Навагрудскай акруговай камендатуры дзяржаўнай паліцыі) занальнага дзяржаўнага архіва ў г. Маладзечна (ЗДАМ).

Карыснымі для дадзенага даследавання сталі справаздачы і рапарты аб грамадска-палітычнай сітуацыі на тэрыторыі Палескага і Навагрудскага ваяводстваў з фонду 1 (Палескае ваяводскае ўпраўленне), фонду 67 (Камандаванне корпуса акругі № 9 Міністэрства ваенных спраў Польшчы) Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці (ДАБВ). Асобныя звесткі былі знойдзены ў фондзе 98 (Бяроза-Картузскі канцэнтрацыйны лагер). Без увагі таксама не засталіся і дакументы адміністрацыйнага і вучэбна-арганізацыйнага характару Палескай школьнай акругі з фонду 59 (Папячыцельства Брэсцкай школьнай акругі), якія перасякаюцца з дакументацыяй з ЛЦДА і ДАГВ.

Пэўная дакументацыя па тэме дысертацыі знаходзіцца ў фондах 242п (Цэнтральный Камітэт Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі) і 883

(Галоўнае праўленне Таварыства беларускай школы) Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь (НАРБ).

Асобныя дакументы змешанага характару, як паліцэйскіх органаў, так і ўнутраных гімназічных, утрымліваюцца ў фондах 3 (Калекцыя дакументаў аддзела рукапісаў Беларускага музея ім. І. Луцкевіча ў г. Вільні) і 443 (Ніжанкоўская Вера Андрэеўна) Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва (БДАМЛіМ).

Даследуючы праблематыку ролі беларускіх гімназій неабходна вылучыць крыніцы асабістага паходжання, або эга-дакументы (аўтабіяграфіі, дзённікі, успаміны, лісты і г.д.). У дысертацыйным даследаванні выкарыстаны дакументы асабістага паходжання А. Клімовіча, Я. Шутовіча, Я. Міско, С. Новік-Пяюна, В. Ніжанкоўскай, М. Бурсевіча, В. Жук-Грышкевіча, С. Каўша, Б. Кіта, Л. Галяка, А. Уласавай, М. Петрыкевіча, К. Главінскай, У. Гуля. Большая частка з іх утрымліваецца ў фондах Цэнтра даследаванняў старадрукаваных выданняў і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (ЦДСВіР ЦНБ НАНБ) і сховішчах Дзятлаўскага дзяржаўнага гісторыка-краязнаўчага музея (ДДГКМ), Мінскага абласнога краязнаўчага музея (МАКМ) і Навагрудскага гістарычна-краязнаўчага музея (НГКМ).

Значную ролю ў раскрыцці некаторых аспектаў тэмы дысертацыйнага даследавання таксама адыгрывае перыядычны друк, у якім спалучаецца матэрыялы як апавядальнага, так і дакументальнага характару. Для правядзення даследавання выкарыстоўваліся публікацыі як з уласна гімназічных выданняў («Вучнёўскі звон», «Маладое жыццё», «Наперад», «Покліч», «Рунь», «Сям'я і школа»), так і з іншай беларускай, савецкай і польскай прэсы («Асьвета», «Бальшавік», «Беларускае слова», «Беларуская доля», «Беларуская крыніца», «Беларуская праўда», «Беларускі дзень», «Беларускі звон», «Беларускі календар», «Беларускія ведамасьці», «Беларускі студэнт», «Доля працы», «Народ», «Народная справа», «Наша будучына», «Наша думка», «Наша праўда», «Родны край», «Савецкая Беларусь», «Сын беларуса», «Сялянская праўда», «Biełaruskaje žyccio», «Kurjer Wileński», «Przegląd Wileński», «Sprawy Narodowościowe» і інш.). Асноўная маса гэтых газет і часопісаў знаходзіцца ў Нацыянальнай бібліятэцы Рэспублікі Беларусь, Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Бібліятэцы Акадэміі навук Літвы імя Урублеўскіх (Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka).

У **раздзеле 1.3 "Метадалогія і метады даследавання"** ахарактарызавана метадалагічная база дысертацыі. Даследаванне было выканана на аснове агульнанавуковых і спецыяльных прынцыпаў гістарычнай

навукі (аб’ектыўнасць і гістарызм, каштоўнасны і сістэмны падыходы). Аўтар звяртаўся да выкарыстання ацэначных паняццяў пры аналізе гістарыяграфічнага матэрыяла ці асобных з’яў.

Для вырашэння пастаўленых задач дысертацыі выкарыстоўваліся агульнанавуковыя метады аналізу і сінтэзу, што дазволіла абгрунтаваць перыяды дзейнасці беларускіх гімназій і стварыць агульную карціну іх функцыянавання.

Сярод сукупнасці спецыяльна-гістарычных метадаў, якія выкарыстоўваліся для дасягнення мэты даследавання, прыярытэтнымі з’яўляліся гісторыка-генетычны, гісторыка-сістэмны, параўнальна-гістарычны, метад гістарычнай перыядызацыі і прасапаграфічны метад. Прынцыпова новым падыходам у вывучэнні беларускіх гімназій стала выкарыстанне метаду прасапаграфіі. У рамках дысертацыйнага даследавання дадзены метад ужываўся пры вывучэнні вучнёўскага склада і педагагічнага корпуса беларускіх гімназій.

У **Главе 2 “Утварэнне і ўмовы дзейнасці беларускіх гімназій”** вызначаюцца ўмовы і абгрунтоўваюцца перыяды дзейнасці беларускіх гімназій у міжваеннай Заходняй Беларусі.

У **радзеле 2.1 “Заканадаўчыя і арганізацыйныя фактары ўтварэння беларускіх гімназій”** паказаны прававое становішча беларускіх гімназій у агульнапольскай адукацыйнай сістэме. Развіццё культурна-асветніцкай справы беларусаў у міжваеннай Польшчы, у тым ліку і арганізацыі нацыянальных школ, было гарантавана міжнароднымі дамоўленасцямі пасля Першай сусветнай вайны, якія ў выніку ўвайшлі ў некаторыя артыкулы Малага Версальскага дагавора. Такія ўмовы дазволілі арганізаваць невялікую сетку ўласных сярэднеадукацыйных устаноў у выглядзе беларускіх гімназій. Трэба падкрэсліць, што арганізацыя беларускай нацыянальнай адукацыі на тэрыторыі Заходняй Беларусі на рубяжы 1910–1920-х гг. праходзіла ў вельмі складаных абставінах. Першыя ўласныя ўстановы – Віленская, Навагрудская, Гродзенская і Гарадоцкая – з’явіліся ва ўмовах польска-савецкай вайны з дазволу польскіх акупацыйных уладаў. Каардынацыю і перамовы з польскімі ўладамі ў гэтых пытаннях вялі прадстаўнікі Цэнтральнай беларускай школьнай рады (ЦБШР) і Таварыства беларускай школы (ТБШ). Далучэнне заходнебеларускіх зямель у склад Польшчы ў выніку Рыжскага мірнага дагавора абумовіла ўключэнне беларускіх школ у польскую агульнадзяржаўную сістэму адукацыі. Паступова на працягу 1920–1930-х гг. прававое становішча беларускіх сярэдніх школ ускладнялася у сувязі з прыняццем новых законаў, якія абмяжоўвалі правы нацыянальных

меншасцяў. Гэта фактычна стала парушэннем міжнародных дамоўленасцей і канстытуцыйных гарантый.

**Радзел 2.2 “Грамадска-палітычныя ўмовы функцыянавання беларускіх гімназій”** раскрывае дзеянні адміністрацыйных органаў польскай дзяржавы ў адносінах да беларускіх гімназій. Першыя некалькі гадоў знаходжання Заходняй Беларусі ў складзе польскай дзяржавы адзначыліся закрыццём некаторых беларускіх гімназій – у Гродна, Нясвіжы і Гарадку. Галоўнымі афіцыйнымі прычынамі гэтаму з’яўлялася адсутнасць належнага фінансавання і перашкода школьных уладаў у атрыманні канцэсіі на іх функцыянаванне. У другой палове 1920-х гг. адбыўся наступ на беларускія гімназіі, звязаныя з грамадска-палітычнымі працэсамі і актыўным удзелам беларускага грамадства ў нацыянальна-вызваленчым руху.

Барацьба з нацыянальным рухам выклікала абурэнне ва ўнутрыгімназічным асяроддзі. Захапленне многімі гімназістамі левардыкальнымі ідэямі было абумоўлена паходжаннем з сялянскага асяроддзя, якое найбольш было ўразлівым перад польскай нацыянальнай і сацыяльнай палітыкай. Гэта, у сваю чаргу, паўплывала на прыняцце рашэнняў аб закрыцці беларускіх гімназій у Радашковічах і Клецку. Адукацыйная рэформа 1932 г. прывяла да этатызацыі беларускіх сярэдніх устаноў у Вільні і Навагрудку, што сведчыла аб намеры польскіх уладаў ажыццявіць палітыку “санацыі” ў сценах культурных і адукацыйных устаноў.

У **Главе 3 “Кадравы і вучнёўскі склад беларускіх гімназій”** дадзена характарыстыка педагагічнага корпусу, зроблены прасапаграфічны аналіз вучнёўскага складу беларускіх гімназій.

У **раздзеле 3.1 “Педагагічны корпус гімназій: фарміраванне і прафесійная характарыстыка”** разглядаецца дзейнасць і ўмовы працы настаўнікаў. Ва ўсіх беларускіх гімназіях педагагічны склад быў поліэтнічным і шматканфесійным, нягледзячы на нацыянальную арыентаванасць устаноў. Амаль усе мелі практычны вопыт выкладання адпаведных прадметаў. З-за абмежаванага фінансавання заробак быў невялікі. Створаныя польскімі ўладамі ўмовы у некаторай ступені абмяжоўвалі дзейнасць педагогаў па падрыхтоўцы беларускіх нацыянальных кадраў. Кваліфікацыя некаторых настаўнікаў не адпавядала польскім адукацыйным стадантрам, што было прычынай ціску на іх з боку школьнай адміністрацыі і стварала падставы для звальненняў. Школьныя кіруючыя органы не прызнавалі праходжанне настаўніцкіх курсаў, асабліва тых, якія адбываліся да 1921 г., і проста ігнаравалі практычны вопыт беларускіх педагогаў. Адначасова з гэтым у гімназіях дастаткова часта змяняліся дырэктары. Польскія ўлады стараліся падабраць больш лаяльных да іх кіраўнікоў. Але пры гэтым, фінансавае і

кваліфікацыйнае пытанне ў педагогаў набывала другасны план, а на першы выходзілі нацыянальная скіраванасць, жаданне пашырыць беларускі культурны дыскурс сярод моладзі ва ўмовах палітыкі паланізацыі і звужэння нацыянальнага школьніцтва. Разам з гэтым, большасць настаўнікаў стваралі цэлы пласт інтэлігенцыі новага пакалення, які быў важным механізмам распаўсюджвання нацыянальнай ідэнтычнасці сярод беларускага насельніцтва Заходняй Беларусі.

У **радзеле 3.2 "Характарыстыка вучнёўскага складу беларускіх гімназій"** прадстаўлены калектыўны партрэт вучняў беларускіх сярэдніх навучальных устаноў. Прасапаграфічны аналіз вучняў паказаў, што кантынгент устаноў першапачаткова складаўся не толькі з прадстаўнікоў беларускай нацыянальнасці. Пасля прыняцця новых пастаноў польскай школьнай адміністрацыяй у 1923–1924 гг. значны працэнт вучняў (у асноўным не беларусы) былі вымушаны пакінуць установы. Нацыянальная і рэлігійная неаднароднасць ніякім чынам не ўплывала на ўзнікненне канфліктаў сярод вучняў. Пераважная большасць навучэнцаў гімназій былі праваслаўнымі беларусамі, беларусы-каталікі складалі невялікую долю навучэнцаў, асабліва па-за межамі Вільні.

Вучні паходзілі з розных сем'яў – святароў, настаўнікаў, фельчараў, адвакатаў. Але вялікі працэнт дзяцей усё ж такі заставаўся сялянскага паходжання, часцей – дзеці незаможных бацькоў. За ўсе гады існавання беларускіх гімназій на тэрыторыі Заходняй Беларусі у міжваенны час навучалася каля 3,1 тыс. вучняў. Навучанне ў беларускіх гімназіях адыходзілла ад звыклай асобнай гендарнай адукацыі, якое практыкавалася ў часы Расійскай імперыі. Нягледзячы на распаўсюджанасць мужчынскіх і жаночых гімназій на тэрыторыі тагачаснай міжваеннай Польшчы у беларускіх гімназіях адначасова на занятках прысутнічалі і хлопцы, і дзяўчаты.

**Глава 4 "Беларускія гімназіі ў грамадска-палітычных і культурных працэсах міжваеннай Заходняй Беларусі"** прысвечана пытанням адукацыйнага працэсу, грамадска-палітычнага і выхаваўчага накірунка дзейнасці беларускіх гімназій, іх уплыву на культурна-асветніцкае жыццё міжваеннай Заходняй Беларусі.

У **раздзеле 4.1 "Асаблівасці адукацыйнага працэсу"** раскрываецца арганізацыя навучання. Адукацыйны працэс у беларускіх гімназіях будаваўся на прынцыпах даступнасці, паступовага адыходу ад традыцыйнага навучання, адаптацыі пад новыя ўмовы грамадства, увядзення методык і педагагічных тэхналогій, распрацоўкі ўласных навучальных выданняў. Галоўным бачылася выхаванне беларускіх патрыётаў і захаванне нацыянальнай ідэнтычнасці. Аднак польскія ўлады імкнуліся ўмешвацца ў навучальны працэс беларускай

сярэдняй школы, закідваючы рознымі патрабаваннямі і загадамі, такім чынам, пагаршаючы становішча гімназій і яго ўнутранага кантынгенту. Вялікая ўвага ў адукацыйным працэсе надавалася развіццю канцэпцыі гуманістычнай і нацыянальна арыентаванай школы. Адпаведна змест навучальных праграм быў накіраваны на вывучэнне беларускай мовы, гісторыі Беларусі і культуры, на фарміраванне і развіццё творчых здольнасцяў.

Беларускія гімназіі не былі багата ўкамплектаваныя падручнікамі па прадметах. Галоўным вучэбна-метадычным цэнтрам стала Віленская беларуская гімназія, якая валодала неабходнай рэсурснай базай. Асноўная задача складалася ў адаптацыі вялікай колькасці падручнікаў пад нацыянальную адукацыю шляхам перакладу на беларускую мову.

**Раздзел 4.2 “Грамадска-палітычныя і выхаваўчая дзейнасць выкладчыкаў і вучняў беларускіх гімназій”** утрымлівае аналіз дзейнасці гімназічнай моладзі і педагогаў у грамадска-палітычным жыцці Заходняй Беларусі. Удзел некаторых педагогаў у беларускіх левых радыкальных арганізацыях адбівалася на выхаваўчым накірунку дзейнасці гімназій. У сярэдзіне 1920-х гг. некаторыя гімназісты пачалі дзейнасць у структурах КПЗБ і КСМЗБ. Барацьба польскіх уладаў з беларускім нацыянальным рухам у другой палове 1920-х гг. прывяла да росту папулярнасці левых радыкальных ідэй сярод гімназічнай моладзі. Разам з гэтым польскія ўлады ў некаторай ступені завышалі ўплыў левых радыкальнага элементу, беспадстаўна абвінавачвалі беларусаў у камуністычнай дзейнасці, што адпаведна адбівалася на лёсе гімназічнай моладзі. Такая сітуацыя фактычна палітызавала дзейнасць беларускіх гімназій, што прывяло да шэрагу судовых працэсаў над навучэнцамі ў канцы 1920-х – першай палове 1930-х гг.

У пачатку 1920-х гг. палітычнай актыўнасць выкладчыцкага корпуса была сканцэнтравана на выбарчай кампаніі ў польскі сейм, якая пазней прывяла да фарміравання парламенцкай фракцыі Беларускага пасольскага клубу. На рубяжы 1920–1930-х гг. некаторыя педагогі гімназій прымалі ўдзел у паланафільскім руху. Найбольш уплывовай палітычнай сілай гэтай плыні была “беларуская санацыя”, якая вызначылася лаяльнасцю і саступкамі ў адносінах да польскіх уладаў у вырашэнні беларускага нацыянальнага пытання, у тым ліку і ў праблеме працы гімназій.

У **радзеле 4.3 “Уплыў беларускіх гімназій на культурна-асветніцкае жыццё беларусаў у Заходняй Беларусі”** раскрываецца важнасць элемента культурна-асветніцкай справы ў выхаваўчым працэсе беларускіх сярэдніх навучальных установ. Сумесная праца вучняў і педагогаў у першую чаргу спрыяла захаванню нацыянальнай самаідэнтычнасці ў маладога пакалення беларусаў. Беларускія гімназіі ў міжваенны перыяд з’яўляліся не проста

ўстановамі адукацыі, а паўнавартаснымі нацыянальна-культурнымі цэнтрамі ў Заходняй Беларусі. Дзякуючы культурна-асветніцкай працы ў гімназіях вучні мелі магчымасць пашыраць свой эстэтычны, інтэлектуальны ўзровень і атрымліваць выхаванне свайго кругагляду ў нацыянальным духу. Заснавальнікі і ўдзельнікі гімназічных таварыстваў, згуртаванняў, скаўцкіх і камсамольскіх атрадаў імкнуліся да аб'яднання моладзі, яе маральнаму і патрыятычнаму выхаванню. Дастаткова вялікая ўвага надавалася фізічнаму развіццю вучняў. Навучэнцы праяўлялі высокую зацікаўленасць да спартыўных актыўнасцяў, ўтвараліся каманды па розных відах спорту, прымаўся ўдзел у гарадскіх спаборніцтвах. Гурткі гімназій трымаліся ў асноўным за кошт плённага энтузіязму навучэнцаў і педагогаў. Аднак гэта патрабавала знешняй падтрымкі, асабліва фінансавай дапамогі. Да таго ж польскія ўлады няўхвальна ставіліся да падобных праектаў, перашкаджаючы большасці пачынанняў.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

**Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі**

1. На фоне змен у грамадска-палітычным становішчы на беларускіх землях у пачатку 1919 г., дзякуючы інтэнсіўнай працы беларускіх арганізацый (БТДАВ, БНК, БНС, Грамада беларускай моладзі ў Гродна і інш.), пачалося ўтварэнне беларускіх гімназій, якія працягнулі сваю дзейнасць на тэрыторыі міжваеннай Заходняй Беларусі ў складзе польскай дзяржавы. Нягледзячы на тое, што ў 1919–1921 гг. фактычна ўсе беларускія школьныя ўстановы былі зачынены, польская адміністрацыя гімназіі практычна не чапала (за выключэннем гімназіі ў Будславе, якая была зачынена ў кастрычніку 1919 г.). Магчыма, гэта было звязана з намерам польскіх акупацыйных улад атрымаць лаяльнасць з боку аўтарытэтных дзеячоў, якія займаліся гэтым пытаннем. Гэтаму таксама спрыялі і міжнародныя дамоўленасці («Малы Версальскі дагавор», Рыжскі мірны дагавор), перад якімі польская дзяржава павінна быць адказная. Аднак пасля ўваходжання заходнебеларускіх тэрыторый у склад Польшчы ў сакавіку 1921 г. прававое становішча беларускіх гімназій пагоршылася, нягледзячы на юрыдычныя і міжнародныя гарантыі адносна спраў нацыянальных меншасцяў.

У функцыянаванні беларускіх гімназій на тэрыторыі Заходняй Беларусі можна вылучыць наступныя перыяды:

I. 1919–1921 гг. – этап станаўлення і арганізацыі беларуская сярэдняй адукацыі ў заходнебеларускім рэгіёне. Ва ўмовах польска-савецкай вайны ўтвараюцца беларускія гімназіі ў Вільні, Навагрудку, Нясвіжы, Гродна і

Гарадку як прыватныя навучальныя ўстановы. У 1921 г. Гродзенская і Гарадоцкая беларускія гімназіі былі зачынены па прычыне адміністрацыйных і фінансавых цяжкасцяў. Значную дапамогу новаўтвораным гімназіям на дадзеным этапе аказвала ВБГ, якая стала ўзорам для вучэбна-метадычнай і выхаваўчай працы.

II. 1921–1928 гг. – беларускія гімназіі сталі часткай польскай адукацыйнай сістэмы ў выглядзе прыватных навучальных устаноў пасля падпісання Рыжскага мірнага дагавора 1921 г. Каардынацыю іх функцыянавання ўзяло на сябе створанае ў гэтым жа годзе ТБШ. Пашырылася геаграфія беларускіх сярэдніх навучальных устаноў у Заходняй Беларусі: былі адкрыты гімназіі ў Радашковічах (1922 г.) і Клецку (1924 г.). У гэты перыяд польскія ўлады ажыццяўлялі спробы пераўтварыць беларускія гімназіі ў двухмоўныя і пачалі ўцягваць іх у палітычныя працэсы. Законам ад 31 ліпеня 1924 г. абмяжоўваліся ўсе намеры адкрыць больш беларускіх школ, уводзілася абавязковае вывучэнне польскай мовы і выкладанне некаторых прадметаў па-польску. Пасля дзяржаўнага перавароту 1926 г. урад пайшоў на некаторыя ўступкі ў дзейнасці беларускіх гімназій, што дало магчымасць выпускнікам у 1927 г. здаваць “матуру” – экзамен для паступлення ў вышэйшыя навучальныя ўстановы Польшчы. Некаторыя педагогі ўдзельнічалі ў структурах БСРГ, а вучні – у КПЗБ і КСМЗБ. Разгром БСРГ у 1927 г. моцна паўплываў на адносіны да польскіх уладаў і ўключэнне беларускіх сярэдніх школ ў палітычную павестку.

III. 1928–1931 гг. – крызісныя з’явы ў функцыянаванні беларускіх гімназій, звязаныя з іх імклівай палітызацыяй. На фоне палітычных працэсаў над беларускімі дзеячамі і арганізацыямі навучэнцы актыўна ўключаліся ў левaрадыкальную дзейнасць камсамола, КПЗБ, МАДР і БСРПК «Змаганне». Такая сітуацыя прывяла да канфрантацыі паміж групамі навучэнцаў і адміністрацыямі гімназій, чым вырашылі скарыстацца польскія ўлады, закрыўшы ў 1928 г. РБГ, а ў 1931 г. – КБГ. У той жа час, польскія ўлады ў гэты перыяд значна завышалі ўзровень радыкалізацыі гімназій і спрабавалі паказаць іх дэструктыўную антыдзяржаўную дзейнасць.

IV. 1932–1939 гг. – канчатковае наступленне польскіх уладаў на беларускую культурна-асветніцкую справу. Ажыццяўленне адукацыйнай рэформы (так званая рэформа Енджаевіча) у 1932 г. прывяло да фактычнай нацыяналізацыі беларускіх гімназій, якія былі пераведзены ў статус дзяржаўных. У жніўні 1934 г. польская школьная адміністрацыя зачыніла НБГ. Забарона дзейнасці ТБШ і БІГіК прывяла да заняпаду барацьбы за беларускую адукацыю, а культурна-асветніцкая актыўнасць беларускага школьніцтва была ўжо не такой яскравай па прычыне абмежаванняў з боку польскіх уладаў.

У 1939 г. на тэрыторыі Заходняй Беларусі дзейнічала толькі адна беларуская гімназія – у Вільні [7; 8; 9; 10; 14; 22].

2. Пры складанні калектыўнага партрэта вучняў беларускіх гімназій было ўстаноўлена, што да 1924 г. у ВБГ і НБГ навучалася да 1/3 прадстаўнікоў яўрэйскай нацыянальнасці. Па прычыне прыняцця закона летам 1924 г., які моцна ўплываў на развіццё нацыянальна-культурнай і асветніцкай справы нацыянальных меншасцяў, а таксама адкрыцця беларускіх гімназій у Радашковічах і Клецку паказчык нацыянальнага складу павялічыўся на карысць беларусаў (да 95 % ад усяго складу). Большая частка вучняў была сялянскага паходжання, радзей – з сем’яў рабочых, мясцовага духавенства і працуючых у гімназіях настаўнікаў. Гэта сведчыць аб выразным намеры бацькоў даць сваім дзецям адпаведную сярэднюю адукацыю з магчымай перспектывай паступлення ў вышэйшыя навучальныя ўстановы. Навучанне ў беларускіх гімназіях было значна таннейшым, чым у польскіх сярэдніх установах адукацыі. Розніца ў аплаце навучання магла адрозніваццa практычна ў 4 разы. Да таго ж выкладанне большасці прадметаў вялося на зразумелай для большасці дзяцей беларускай мове. Адукацыйны працэс у беларускіх гімназіях адыходзіў ад сегрэгаванага гендарнага навучання. Наяўнасць значнага працэнта дзяўчын у складзе вучняў гімназій сведчыла аб паступовай эмансіпацыі беларускіх жанчын і адыходу ад стандартаў традыцыйнага грамадства. За ўвесь час існавання беларускіх гімназій праз іх сцены прайшло каля 3,2 тыс. навучэнцаў: ВБГ – каля 1,5 тыс.; НБГ – каля 500; РБГ – каля 500; КБГ – каля 300; Гродзенскай – каля 110; Нясвіжскай – каля 120; Гарадоцкай – каля 160.

Нацыянальны і канфесійны склад педагагічнага корпусу таксама з’яўляўся неаднародным. Сярод настаўнікаў былі прадстаўнікі беларускай, рускай, польскай, яўрэйскай, нямецкай, французскай нацыянальнасцяў. Гэтага вымагала наяўнасць вучняў розных этнасаў. Да 80 % усіх педагогаў з’яўляліся праваслаўнымі. Умовы працы былі досыць цяжкімі. Беднае фінансаванне беларускіх навучальных установаў абумовіла нізкую заработную плату работнікаў, якая была значна меншая, чым у настаўнікаў польскіх школ. Неабходна падкрэсліць, што неспрыяльныя ўмовы адыходзілі на другі план. Многія настаўнікі з’яўляліся прадстаўнікамі беларускага нацыянальнага руху, таму яны стымулявалі масавы рост нацыянальнай самасвядомасці, садзейнічалі кансалідацыі маладога пакалення беларусаў. Але ў той жа час некаторыя настаўнікі, нягледзячы на свой практычны вопыт, не мелі кваліфікацыі, якая б адпавядала тагачасным польскім стандартам. Гэта станавілася афіцыйнай падставай для звальнення школьнымі ўладамі таленавітых педагогаў [1; 2; 11; 12; 13; 17; 18].

3. Палітыка паланізацыі моцна ўплывала на развіццё адукацыі ў Заходняй Беларусі, што непасрэдна адбівалася на ўнутраным жыцці беларускіх гімназій. Трэба адзначыць, што да сярэдзіны 1920-х гг. гімназічная грамадскасць не выяўляла шырокай палітычнай актыўнасці, за выключэннем некаторых педагогаў. У 1922 г. выкладчыкі ВБГ М. Кахановіч, Б. Тарашкевіч, В. Багдановіч, С. Рак-Міхайлоўскі, А. Станкевіч і канцэсіянер РБГ А. Уласаў прынялі ўдзел у выбарчай кампаніі ў польскі сейм, пазней заснаваўшы парламенцкую фракцыю "Беларускі пасольскі клуб".

Шырокай грамадска-палітычнай актыўнасці навучэнцаў у той час не назіралася, усё абмяжоўвалася культурна-асветніцкай дзейнасцю. Са з'яўленнем КПЗБ і КСМЗБ нязначная колькасць вучняў падпольна працавала ў іх арганізацыйных структурах. Разгорнутая польскімі ўладамі барацьба супраць беларускага нацыянальнага руху, забарона арганізацый (БСРГ, ТБШ і інш.) прывялі да радыкалізацыі большасці навучэнцаў беларускіх гімназій у бок левых ідэй, што было адпаведнай рэакцыяй на палітыку ўладаў. Наступствы гэтай кан'юнктуры прывялі да ўдзелу значнай колькасці навучэнцаў і выкладчыкаў у грамадска-палітычным жыцці, а барацьба за захаванне беларускіх школ і гімназій фактычна стала новым вітком нацыянальнага руху. У такіх абставінах кіраўніцтва гімназій, перш за ўсё ВБГ, палічыла мэтазгодным пайсці на палітычнае супрацоўніцтва з польскімі ўладамі ("беларуская санацыя"), ахвяраваўшы існаваннем устаноў у Радашковічах і Клецку, а таксама часткай вучнёўскага кантынгенту і некаторымі педагогамі, якія ў выніку маглі падвяргацца ганенням з боку польскай паліцыі. Такім чынам яны мелі намер захаваць вядучыя на той момант гімназіі Вільні і Навагрудку, што, аднак, не ўдалося [4; 5; 19].

4. Беларускія гімназіі з'яўляліся адным з нацыянальна-культурных цэнтраў міжваеннай Заходняй Беларусі ва ўмовах паланізацыі. Важную ролю адыгрывалі прадметы цыклу беларусазнаўства (беларуская мова, беларуская літаратура, гісторыя Беларусі, геаграфія Беларусі), якія адначасова фарміравалі і пашыралі адукацыйную базу і спрыялі захаванню нацыянальна-культурных традыцый сярод вучняў.

У беларускіх гімназіях ад пачатку існавання была разгорнута шырокая культурна-асветніцкая праца. Гімназісты наладзілі інтэнсіўную дзейнасць па выпуску перыядычных выданняў («Маладое жыццё», «Усход», «Рунь», «Зорка», «Пралескі», «Наперад», «Рэха», «Покліч», «Вучнёўскі звон» і інш.), арганізацыі гурткоў па інтарэсах (драматычных, літаратурных, гістарычных, музычных, мастацкіх і г.д.). Вялізарная роля ў гэтай справе належала таксама і настаўнікам. Педагогі А. Валынчык, Ф. Аляхновіч, А. Згірскі, А. Стэповіч, Р. Шырма, А. Шумскі, Я. Шнаркевіч, Я. Гаўрылік, Я. Драздовіч і іншыя

актыўна садзейнічалі развіццю творчых здольнасцяў маладога пакалення беларусаў. Асветніцкая праца не абмяжоўвалася сценамі гімназій. Педагогі і навучэнцы арганізоўвалі канцэрты, тэатральныя пастаноўкі, лекцыі, ў тым ліку і для мясцовых жыхароў наваколля Вільні, Навагрудка, Радашковічаў і Клецка. Некаторыя выпускнікі беларускіх гімназій у будучым сталі "рухавікамі" беларускай навукі і культуры: В. Таўлай, М. Танк (Я. Скурко), Я. Міско, А. Іверс (І. Міско), А. Шыдлоўскі, Л. Барысаглебскі і іншыя.

Галоўнай задачай вучэбна-выхаваўчага працэсу ў беларускіх гімназіях стала пабудова дэмакратычнай працоўнай школы, дзе ў вучняў павінны развівацца разумовыя, фізічныя і эстэтычныя навыкі, фарміравацца нацыянальная самасвядомасць і выхоўвацца пачуццё патрыятызму. Дзякуючы адукацыйнаму працэсу і пазашкольнай рабоце вучні гімназій атрымлівалі веды аб гісторыі і культуры Беларусі, на фоне чаго ўмацоўвалася іх уяўленне аб каштоўнасці беларускай дзяржаўнасці. На працягу ўсяго часу вучэбна-метадычным цэнтрам беларускай пачатковай і сярэдняй адукацыі ў міжваеннай Заходняй Беларусі з'яўлялася ВБГ. Педагогі гімназіі Б. Тарашкевіч, А. Смоліч, А. Неканда-Трэпка, М. Гарэцкі, Л. Гарэцкая, І. Дварчанін, С. Паўловіч і іншыя ўнеслі значны ўклад у развіццё айчыннай вучэбна-метадычнай базы шляхам распрацоўкі вялікай колькасці асветніцкіх выданняў, кніг і падручнікаў [3; 6; 15; 16; 20; 21].

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў**

Вынікі дысертацыйнай працы могуць стаць фактaлагічнай і метадалагічнай асновай даследавання навуковымі ўстановамі асобных праблем па гісторыі Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд, пры вывучэнні гісторыі беларускага нацыянальнага руху ў першай палове XX ст., адукацыі і культуры ў рамках лекцыйных і спецыяльных курсаў устаноў вышэйшай і сярэдняй адукацыі (Акт укаранення ад 30.08.2023 № 03-8/037). Да прадстаўленых матэрыялаў можна звяртацца пры стварэнні навуковых манаграфій, даведнікаў, дапаможнікаў, музейных экспазіцый, а таксама пры падрыхтоўцы дакументальных і мастацкіх кінастужак. Навуковыя напрацоўкі даследавання ў сукупнасці з выкарыстаннем іншых галін сацыяльна-гуманітарных ведаў патэнцыйна выступаюць у якасці дапаможнай інфармацыі для стварэння асноўных напрамкаў адукацыйнай палітыкі сучаснай беларускай дзяржавы.

# СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА НАВУКОВАЙ СТУПЕНІ

## Артыкулы ў навуковыхчасопісах, адпавядаючых п. 19 Палажэння аб прасуджэнні навуковых ступеняў і прысваенні навуковых званняў у Рэспубліцы Беларусь

1. Ананька, К. Д. Вучні беларускіх гімназій у міжваеннай Заходняй Беларусі: прасапаграфічны аналіз / К. Д. Ананька, А. С. Горны // Гісторыя і грамадазнаўства. – 2022. – № 4. – С. 41–47.

2. Ананька, К. Д. Педагагічны корпус беларускіх гімназій у міжваеннай Заходняй Беларусі (1919–1939): фарміраванне і прафесійная характарыстыка / К. Д. Ананька // Гісторыя і грамадазнаўства. – 2023. – № 1. – С. 17–25.

3. Ананька, К. Д. Культурна-асветніцкае жыццё беларускіх гімназій у Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / К. Д. Ананька // Беларускі гістарычны часопіс. – 2023. – № 11. – С. 52–57.

4. Ананька, К. Д. «Каціныя спевы»: палітычная актыўнасць вучняў беларускіх гімназій у міжваеннай Заходняй Беларусі / К. Д. Ананька // Весці БДПУ. Сер. 2. Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія. – 2023. – № 4. – С. 88–94.

5. Ананька, К. Д. Ліквідацыя беларускіх сярэдніх школ у міжваеннай Заходняй Беларусі / К. Д. Ананька // Вестник МГИРО. – 2024. – № 1. – С. 35–42.

6. Ананька, К. Д. Асаблівасці адукацыйнага працэсу ў беларускіх гімназіях міжваеннай Заходняй Беларусі / К. Д. Ананька // Беларуская Думка. – 2024. – № 4. – С. 78–85.

7. Ананька, К. Д. Прававыя асаблівасці ўтварэння і функцыянавання беларускіх гімназій у міжваеннай Польшчы / К. Д. Ананька // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Сер. 1. Гісторыя і археалогія. Філасофія. Паліталогія. – 2024. – Т. 16, № 2. – С. 51–58.

8. Ананька, К. Д. Утварэнне беларускіх гімназій на тэрыторыі Заходняй Беларусі на рубяжы 1910–1920-х гадоў / К. Д. Ананька // Вестник БарГУ. Сер.: Исторические науки и археология. Экономические науки. Юридические науки. – 2024. – № 1. – С. 6–13.

9. Ананька, К. Д. Перыядызацыя функцыянавання беларускіх гімназій на тэрыторыі Заходняй Беларусі (1919–1939 гг.) / К. Д. Ананька // Труды БГТУ. Серия 6. История, философия. – 2024. – № 2. – С. 41–45.

## Артыкулы ў зборніках навуковых артыкулаў і іншых выданнях

10. Ананька, К. Д. Беларускія гімназіі ў Заходняй Беларусі: сучасная айчынная гістарыяграфія праблемы / К. Д. Ананька // Государства

Центральной и Восточной Европы в исторической перспективе : сб. науч. ст., Полес. гос. ун-т, г. Пинск. 25 фев. 2022 г. / Мин-во обр-ния РБ [и др.]; редкол.: В. И. Дунай [и др.]. – Пинск, 2022. – Вып. 7. – С. 192–195.

11. Ананько, К. Д. Учащиеся Виленской белорусской гимназии в межвоенной Западной Беларуси: аспекты коллективной биографии / К. Д. Ананько // Устойчивое развитие науки и образования. – 2022. – № 7. – С. 26–31.

12. Ананько, К. Д. Социальная и образовательная характеристики педагогического корпуса белорусских гимназий в межвоенной Западной Беларуси / К. Д. Ананько // Социальные, культурные и коммуникативные практики в динамике общественного развития : сб. науч. ст. / ГрГУ им. Янки Купалы ; редкол.: В. А. Белозорович (гл. ред.) [и др.]. – Гродно, 2022. – С. 128–132.

13. Ананька, К. Д. Метад прасапаграфіі ў вывучэнні беларускіх гімназій у міжваеннай Заходняй Беларусі / К. Д. Ананька // Смена парадигм в исторической науке: новые вызовы, теоретические поиски, исследовательские практики : сб. науч. ст. / ГрГУ им. Янки Купалы ; редкол.: В. А. Белозорович (гл. ред.), О. В. Воробьёва (гл. ред.) [и др]. – Гродно, 2023. – С. 268–272.

14. Ананька, К. Д. Да гісторыі існавання Гродзенскай беларускай гімназіі ў 1920–1921 гг. / К. Д. Ананька // Беларусь у кантэксце еўрапейскай гісторыі: асоба, грамадства, дзяржава : зб. навук. арт. / ГрДУ імя Янкі Купалы ; рэдкал.: А. А. Каваленя (гал. рэд.), І. Ф. Кітурка (гал. рэд.) [і інш.]. – Гродна, 2023. – С. 253–255.

15. Ананька, К. Д. Дзейнасць скаўцкіх атрадаў у беларускіх гімназіях міжваеннай Заходняй Беларусі / К. Д. Ананька // Беларусь і суседзі: шляхі фарміравання дзяржаўнасці, міжнацыянальныя і міждзяржаўныя адносіны : зб. навук. арт. / ГДУ імя Ф. Скарыны ; рэдкал.: М.М. Мязга (гал. рэд.) і [інш.]. – Гомель, 2024. – Вып. 9. – С. 139–142.

16. Ананько, К. Д. «Спрытгурмисты и гайсаки»: скаутское движение в белорусских гимназиях межвоенной Польши / К. Д. Ананько // Восточнославянские исследования / Ин-т славяноведения РАН ; гл. ред. Б. Н. Флоря. – М., 2024. – Вып. 3. – С. 115–127.

**Матэрыялы навуковых канферэнцый**

17. Ананька, К. Д. Настаўнікі праваслаўнага Закона Божага ў беларускіх гімназіях міжваеннай Заходняй Беларусі / К. Д. Ананька // Пічэтаўскія чытанні –2022: універсітэты і архівы як састаўныя элементы экалогіі і культуры : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 30 верас. 2022 г. / Беларус. дзярж. ун-т ; навук. рэд. М. Ф. Шумейка, А. А. Яноўскі ; рэдкал.: А. Г. Каханоўскі (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2022. – С. 47–52.

18. Ананько, К. Д. Православное законоучителькое дело в Новогрудской, Радошковичской и Клецкой белорусских гимназиях межвоенной Западной Беларуси / К. Д. Ананько // XVI Машеровские чтения : материалы Междунар. науч.-практ. конф. студ., аспир. и молодых ученых, Витебск, 21 окт. 2022 г. : в 2 т. / Витеб. гос. ун-т ; редкол.: Е. Я. Аршанский (гл. ред.) [и др.]. – Витебск, 2022. – Т. 2. – С. 34–36.

19. Ананька, К. Д. Успаміны як крыніцы па гісторыі беларускіх гімназій у міжваеннай Заходняй Беларусі / К. Д. Ананька // Актуальные проблемы источниковедения : материалы VII Междунар. науч.-практ. конф., Витебск, 27–29 апр. 2023 г. : в 2 т. / Витеб. гос. ун-т ; редкол.: А. Н. Дулов и М. Ф. Румянцева (отв. ред.) [и др.]. – Витебск, 2023. – Т. 2. – С. 169–171.

20. Ананька, К. Д. Кніжныя выданні ў навучальным працэсе беларускіх гімназій у міжваеннай Заходняй Беларусі / К. Д. Ананька // Берковские чтения – 2023. Книжная культура в контексте международных контактов : материалы VII Междунар. науч. конф., Брест, 24–25 мая 2023 г. : в 2 т. / сост.: Л. А. Авгуль, Н. В. Вдовина. – Москва ; Минск, 2023. – Т. 1. – С. 13–19.

21. Ананько, К. Д. Преподавание истории в белорусских гимназиях межвоенной Западной Беларуси / К. Д. Ананько // Этнос и общество в контексте межнациональных отношений : материалы IX Междунар. науч.-практ. конф., Краснодар, 7 дек. 2023 г. / Кубанск. гос. ун-т ; редкол.: Т. А. Хагуров [и др.]. – Краснодар, 2023. – С. 405–410.

**Тэзісы дакладаў**

22. Ананька, К. Д. Беларускія гімназіі ў міжваеннай Заходняй Беларусі: сучасны стан даследаванняў / К. Д. Ананька // Ars Longa: навуковыя дасягненні і перспектывы : зб. тэзісаў V Міжнар. навук.-практ. канф. маладых даследчыкаў Інстытута гісторыі НАН Беларусі, Мінск, 21–22 крас. 2022 г. / пад рэд. Т. Даўгач [і інш.]. – Мінск, 2022. – С. 17–20.

## РЭЗЮМЭ

**Ананька Кірыл Дзмітрыевіч**

**Беларускія гімназіі ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.)**

**Ключавыя словы:** беларускія гімназіі, міжваенны перыяд, Заходняя Беларусь, грамадска-палітычнае жыццё, культурнае жыццё.

**Мэта даследавання** – раскрыць станаўленне і асаблівасці развіцця беларускіх гімназій у Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд, іх уплыў на захаванне нацыянальнай ідэнтычнасці ва ўмовах палітыкі паланізацыі.

**Метады даследавання.** У дысертацыі выкарыстоўваліся як агульнанавуковыя (аналіз, сінтэз), так і спецыяльна-гістарычныя (гісторыка-генетычны, гісторыка-сістэмны, прасапаграфічны, параўнальна-гістарычны, гістарычнай перыядызацыі) метады. Даследаванне пабудавана на аснове прынцыпаў аб’ектыўнасці і гістарызму, каштоўнаснага і сістэмнага падыходаў.

**Атрыманыя вынікі і іх навізна.** Дадзеная дысертацыя з’яўляецца першым у айчыннай гістарыяграфіі комплексным даследаваннем функцыянавання беларускіх гімназій на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1919–1939 гг. Дадзена навуковае абгрунтаванне беларускіх гімназій як установ па захаванню нацыянальнай самасвядомасці беларусаў ва ўмовах палітыкі паланізацыі, распрацавана навуковая перыядызацыя іх дзейнасці. Прааналізаваны палітычныя ўмовы ўтварэння беларускіх сярэдніх навучальных установ і іх прававое становішча, выяўлены праекты стварэння сярэдніх беларускіх школ, якія раней у айчыннай гістарыяграфіі не згадваліся. На аснове біяграфічных і статыстычных дадзеных быў складзены калектыўны партрэт вучнёўскага складу і педагагічнага корпуса беларускіх гімназій. Упершыню прааналізавана спецыфіка беларускіх сярэдніх навучальных установ як аднаго з цэнтраў культурнага жыцця ў міжваеннай Заходняй Беларусі.

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў**. Вынікі дысертацыйнай працы могуць знайсці прымяненне пры даследаванні асобных праблем гісторыі Беларусі, адукацыі і культуры, а таксама выкарыстоўвацца пры стварэнні манаграфій, дапаможнікаў і музейных экспазіцый.

**Вобласць выкарыстання:** гісторыя Беларусі, гісторыя беларускай дзяржаўнасці, гісторыя культуры, музейная справа, адукацыя.

# РЕЗЮМЕ

**Ананько Кирилл Дмитриевич**

**Белорусские гимназии в Западной Беларуси (1921–1939 гг.)**

**Ключевые слова:** белорусские гимназии, межвоенный период, Западная Беларусь, общественно-политическая жизнь, культурная жизнь.

**Цель исследования** – раскрыть становление и особенности развития белорусских гимназий в межвоенной Западной Беларуси, их влияние на сохранение национальной идентичности в условиях политики полонизации.

**Методы исследования.** В диссертации использовались как общенаучные (анализ, синтез), так и специально-исторические (историко-генетический, историко-системный, просопографический, сравнительно-исторический, исторической периодизации) методы. Исследование построено на основе принципов объективности и историзма, ценностного и системного подходов.

**Полученные результаты и их новизна.** Данная диссертация является первым в отечественной историографии комплексным исследованием функционирования белорусских гимназий на территории Западной Беларуси в 1919–1939 гг. Дано научное обоснование белорусских гимназий как учреждений по сохранению национального самосознания белорусов в условиях политики полонизации, разработана научная периодизация их деятельности. Проанализированы политические условия образования белорусских средних учебных заведений и их правовое положение, выявлены проекты создания средних белорусских школ, которые ранее в отечественной историографии не упоминались. На основе биографических и статистических данных был составлен коллективный портрет ученического состава и педагогического корпуса белорусских гимназий. Впервые проанализирована специфика белорусских средних учебных заведений как одного из центров национально-культурной жизни в межвоенной Западной Беларуси.

**Рекомендации по практическому использованию результатов.** Результаты диссертационной работы могут найти применение при исследовании отдельных проблем истории Беларуси, образования и культуры, а также использоваться при создании монографий, пособий и музейных экспозиций.

**Область использования:** история Беларуси, история белорусской государственности, история культуры, музейное дело, образование.

## SUMMARY

**Ananka Kiryl Dzmitryevich**

**Belarusian gymnasiums in Western Belarus (1921–1939)**

**Key words:** belarusian gymnasiums, interwar period, Western Belarus, socio-political life, cultural life.

**Research objective** – to reveal the features of the formation and development of belarusian gymnasiums in Western Belarus during the interwar period, their impact on the preservation of national identity in the context of polonization policy.

**Research methods.** General scientific (analysis, synthesis) and special historical (historical-genetic, historical-systemic, prosopographic, comparative-historical, historical periodization) methods were used in the dissertation. The research is based on the principles of objectivity and historicism, value-based and systemic approaches.

**The results obtained and their novelty.** This dissertation is the first comprehensive study in the domestic historiography of the functioning of belarusian gymnasiums in Western Belarus in 1919–1939. The scientific substantiation of belarusian gymnasiums as institutions for preserving the national identity of Belarusians in the conditions of the policy of polonisation is given, and a scientific periodisation of their activities is developed. The political conditions of belarusian secondary schools and their legal status were analysed, and the projects of creating belarusian secondary schools, which had not been mentioned earlier in the national historiography, were revealed. On the basis of biographical and statistical data, a collective portrait of the student body and pedagogical corps of belarusian gymnasiums was compiled. The specifics of belarusian secondary schools as one of the centres of national and cultural life in interwar Western Belarus were analysed for the first time.

**Recommendations for the practical use of the results.** The results of the dissertation work can be used in the study of individual problems of the history of Belarus, education and culture, also can be used in the creation of monographs, manuals and museum exhibitions.

**Field of application:** the history of Belarus, the history of the belarusian statehood, the history of culture, museum business, education.